# Журналістыка

*Я.Ф. КОНЕЎ*

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ ДРУКАВАНЫХ СМІ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XXI ст.

Исследуются предпосылки и тенденции современных реорганизаций в информационном пространстве Республики Беларусь. Рассматривается необратимость проведенных преобразований, характер и перспективы создания более оптимальной модели государственных печатных средств массовой информации.

The article deals with pre-conditions and tendencies of actual changes in the information space of the Republic of Belarus. The character of the changes that have been made and the perspectives of the creation of a better model of state printed mass media are touched upon.

З моманту абвяшчэння Рэспублікі Беларусь (19 верасня 1991 г.) айчынныя друкаваныя СМІ перажылі сапраўдны “інфармацыйны выбух”. Пра гэта яскрава сведчаць сухія статыстычныя дадзеныя Дзяржкамдруку (з 2001 г. – Міністэрства інфармацыі). Так, у 1991 г. ім было зарэгістравана 224 газеты (сярод іх 135 беларускамоўных) і 129 часопісаў. У 1995 – 494 газеты (з іх 210 беларускамоўных) і 225 часопісаў. У 1997 – 688 газет, 248 часопісаў, 51 бюлетэнь і адзін альманах. Напрыканцы таго ж года 28 газет і часопісаў займелі свае Інтэрнет-версіі. У 1999 г. – 715 газет, 284 часопісы, 55 бюлетэняў і адзін альманах. У 2000 – 738 газет, 318 часопісаў, 54 бюлетэні, адзін альманах і адзін каталог. У 2001 – 725 газет, 361 часопіс, 46 бюлетэняў і адзін каталог. На 1 студзеня 2003 г. у краіне зарэгістравана 851 газета, 435 часопісаў, 56 бюлетэняў, тры каталогі, два альманахі. Сярод іх беларускамоўных выданняў – 119, рускамоўных – 481, астатнія – макаранічныя.

Трэба таксама ўлічваць, што працэс з'яўлення і знікнення выданняў за гэты перыяд меў досыць дынамічны характар. Напрыклад, са жніўня 1999 па жнівень 2000 г. Дзяржкамдрук ануляваў 329 пасведчанняў аб рэгістрацыі выданняў, а са жніўня 2000 па жнівень 2001 – 480. Ануляваліся пасведчанні тым выданням, якія не выдаваліся на працягу квартала. Разам з тым толькі за восем месяцаў 2001 г. Дзяржкамдрук выдаў 509 ліцэнзій на выдавецкую дзейнасць.

Аднак друкаваным СМІ ў гэты перыяд былі ўласцівыя не толькі імклівая дынаміка росту, колькасная перавага недзяржаўных выданняў над дзяржаўнымі (2/3 усіх выданняў і сёння не фінансуюцца з бюджэту), але і пераход да шматаблічнай журналістыкі.

З нашага пункта гледжання, ужо на момант абвяшчэння Рэспублікі Беларусь дзяржаўны друк з "прываднога рамяня" КПБ, інструмента партыйнай прапаганды, трансфармаваўся ў "грамадскую трыбуну", адкрытую для выказвання самых розных думак і меркаванняў. Ужо ў сярэдзіне 1990-х гг. беларускія СМІ, акумулюючы грамадзянскія інтарэсы,ператварылі сацыяльна-палітычныя і эканамічныя змены ў безупынны медыяпрацэс. Адзначым, што аналагічная з'ява ў той перыяд была ўласцівая і мас-медыя краін Цэнтраль-

най і Усходняй Еўропы. СМІ Чэхіі, Польшчы, Славакіі і Балгарыі пачалі актыўна вызначаць фармат унутрыпалітычных адносін (гл. Люмичева 1995, 32). Не дзіва, што і беларускія дзяржаўныя СМІ, якія не абмінуў агульнакантынентальны ўплыў, паступова трансфармаваліся ў сістэмаўтваральны элемент улады. Беларускі друк займеў адчувальны кантроль над дзейнасцю грамадскіх структур, «прапускаючы яе праз свае "фільтры", акцэнтуючы асобныя элементы палітычнага працэсу, павышаючы каштоўнасць адной ідэі, абясцэньваючы іншую» (Вараб'ёў 2002, 8).

У якасці прыкладу дастаткова параўнаць, з якой пампезнай увагай асвятлялі дзяржаўныя выданні Першы з'езд беларусаў свету ў чэрвені 1993 г. і наколькі мала ўвагі надалі Другому з'езду беларусаў свету праз тры гады. У першым выпадку была відавочнай папулярызацыя ідэі згуртавання нацыі на аснове этнічнай прыналежнасці. У другім выпадку назіралася яе "абясцэньванне", паколькі журналісты дзяржаўных выданняў скіравалі ўвагу на пошук ідэйных прыярытэтаў унутры краіны, а не за яе межамі. Але самым істотным нам падаецца тое, што, нягледзячы на "завышэнне" і "абясцэньванне" тых ці іншых ідэй, беларускі друк засведчыў адзін з галоўных прыярытэтаў сваёй дзейнасці – з'яднанне нацыі на падставе агульных духоўных каштоўнасцей.

Разумеючы, што фарміраванню інфармацыйнай прасторы Беларусі трэба надаваць значна больш увагі, адчуваючы важнасць і складанасць гэтага працэсу, Прэзідэнт А.Р. Лукашэнка пасля перамогі на выбарах 9 верасня 2001 г., пераабрання на другі тэрмін, Указам № 516 унёс змены ў структуру ўрада. Дзяржаўны камітэт па друку рэарганізаваўся ў Міністэрства інфармацыі, якое ўзначаліў старшыня Дзяржкамітэта Міхаіл Падгайны. Атрымаўшы своеасаблівы карт-бланш ад кіраўніцтва краіны, Міністэрства інфармацыі прыступіла да адной з самых кардынальных рэформ у беларускіх СМІ. Яшчэ ў снежні 2001 г. міністр інфармацыі папярэдзіў, што з другой паловы 2002 г. пачнецца пераразмеркаванне інфармацыйнага поля Беларусі за кошт стварэння медыяхолдзінгаў, у якіх аб'ядналіся б творчыя кадры блізкіх па тэматыцы і аўдыторыі газет і часопісаў (гл. Томашевская 2001, 3).

Адным з галоўных накірункаў дзейнасці Мініінфармацыі стала стварэнне міжраённых газет. Гэты праект распрацоўваўся М. Падгайным з 1997 г. Яго сутнасць – на некалькі раёнаў планавалася выдаваць газету, у якой мелася агульная для ўсіх інфармацыя і спецыяльная інфармацыя для кожнага раёна – у выглядзе "укладыша" або "ніжняга падвала". Прадугледжвалася наступная структура "міжраёнкі": асноўны тэхнічны персанал працуе ў цэнтральнай рэдакцыі, а карэспандэнты раённых газет з рэгіёнаў пастаўляюць інфармацыю.

Эксперымент з выданнем пробных нумароў быў запланаваны на першую палову 2002 г. Стварэнне "міжраёнак" павінна было вырашыць кадравыя пытанні ў Магілёўскай і Гомельскай абласцях, дзе катастрафічна не хапала журналістаў для выпуску паўнавартасных выданняў. На жаль, эксперымент не ажыццявіўся ў поўнай ступені з-за недастатковага бюджэтнага фінансавання.

Тэхнічная і фінансавая дапамога Мініінфармацыі дзяржаўнай рэгіянальнай прэсе, тым не менш, мела пэўныя станоўчыя вынікі. Ужо напрыканцы 2002 г. дзясяткі рэгіянальных выданняў пачалі выкарыстоўваць каляровы друк. І калі ў сталіцы ў гэты перыяд новыя спецыялізаваныя выданні арыентаваліся на пэўныя колы чытацкай аўдыторыі, дык абласны і тым больш раённы друк імкнуўся, наадварот, "згуртаваць" сваіх чытачоў, задаволіць іх самыя разнастайныя інтарэсы. Ідэйнае абгрунтаванне напрамкаў дзейнасці дзяржаўных рэгіянальных выданняў увасобілася ў словах галоўнага рэдактара газеты "Могилевские ведомости" Барыса Лагоўскага: "Мы імкнёмся аператыўна адсочваць, аналізаваць па магчымасці ўсе працэсы і тэндэнцыі ў рэгіёне і краіне, але найперш заклапочаны тым, каб адлюстраваць усё разумнае, здаровае, карыснае, стваральнае, добрае і светлае, што аб'ядноў-

вае людзей, надае ім аптымізму" (Булава 2002, 6). Характэрна, што гэтая жыццесцвярджальная, канструктыўная тэндэнцыя з'яўляецца важнай адметнасцю нашага дзяржаўнага друку ў пачатку XXI ст.

У 1999–2000 гг. кіраўніцтва Дзяржкамдруку неаднойчы папярэджвала аб вымушаным скарачэнні з-за эканамічных абставін колькасці рэспубліканскіх выданняў, якія знаходзіліся на бюджэтным фінансаванні. У пачатку 2001 г. мелася 47 такіх выданняў – "донараў". З іх напрыканцы года чатыры выйшлі на поўную самаакупнасць. Мінінфармацыі дазволіла ім выкарыстаць прыбытак на развіццё.

У 2002 г. пачалося даўно абяцанае скарачэнне непрыбытковых бюджэтных выданняў. У лютым спынілася фінансаванне часопіса "Першацвет" (выдаваўся са снежня 1992 г.), газеты "Сям'я" (аднавілася праз пяць месяцаў), часопіса "Асновы мастацтва" (з 1995 г. выходзіў у серыі "В помощь педагогу" ў выдавецтве "Адукацыя і выхаванне").

У красавіку адбылася падзея, якая, з нашага пункта гледжання, істотна трансфармавала айчынную інфармацыйную прастору, выклікала значны рэзананс сярод супрацоўнікаў друкаваных СМІ і ў грамадстве. Літаратурна-мастацкія часопісы "Полымя", "Маладосць", "Нёман", "Крыніца", "Всемирная литература" і штотыднёвік "Літаратура і мастацтва" аб'ядналі ў рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову "Літаратура і мастацтва". Узначаліў гэты холдзінг дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Беларусі Сяргей Касцян. Газету "Культура" і часопіс "Мастацтва" аб'ядналі ў рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову "Культура". Арганізацыйныя пераўтварэнні суправаджаліся заменамі галоўных рэдактараў, звальненнямі часткі супрацоўнікаў і выразнай зменай рэдакцыйнай палітыкі выданняў.

У ліпені адбылося пераўтварэнне сямі дзяржвыдавецтваў у тры: выдавецтвы "Полымя" і "Ураджай" далучыліся да "Беларусі", "Юнацтва" – да "Мастацкай літаратуры", "Універсітэцкае" – да "Вышэйшай школы".

Галоўным вынікам гэтых пераўтварэнняў, меркавалася з пункта гледжання кіраўніцтва Міністэрства інфармацыі, стане эканомія дзяржаўных сродкаў, больш эфектыўнае выкарыстанне дзярждатацый і адпаведна якасны рост матэрыялаў выданняў, павелічэнне колькасці іх падпісчыкаў. Не сакрэт, што неабходнасць арганізацыйных змен выспявала: у апошнія гады змяншаўся фармат выданняў "Полымя", "Маладосці", "Нёмана" і "Крыніцы", пагаршалася іх паліграфічная якасць, не набыла папулярнасці "Всемирная литература", падаў наклад і зніжалася колькасць падпісчыкаў. Як слушна заўважаў рэдактар часопіса "ARCHE" Валерка Булгакаў, па сваіх пераканаННЯХ далёкі ад сімпатый да кіруючай эліты, «рэдакцыі гэтых выданьняў былі шчыра перакананыя ў тым, што дзякуючы паважнаму веку рэдагаваных імі выданьняў апошнія набылі статус "сьвятарнае каровы" беларускае культуры. І замест таго, каб шукаць новых формаў дыстрыбуцыі часопісаў, павышаць іх самаакупнасьць і пашыраць чытацкую аўдыторыю, да апошняга чапляліся за дзяржаўную падтрымку...» (Булгакаў 2002, 13).

Трэба зазначыць, што першы медыяхолдзінг з'явіўся на Беларусі яшчэ ў 2000 г.: ён злучаў сталічнае тэлебачанне (з 2002 займела статус Трэцяга нацыянальнага канала), радыёстанцыю "Сталіца" і рэдакцыю газеты "Минский курьер". Яго ўтварэнне не мела ніякага рэзанансу і ўспрымалася як звычайная рэарганізацыя. Укараненне аналагічнай мадэлі ў друкаваных СМІ, традыцыйным падмурку нацыянальнай культуры, суправаджалася заявамі ў недзяржаўным друку пра "наступленне на свабоду слова".

З нашага пункта гледжання, калі б праблема нацыянальнага самаўсведамлення і стан развіцця нацыянальнай мовы ў Беларусі былі б аналагічнымі наяўным у Вялікабрытаніі, то можна было гаварыць пра аналагічнасць дадзенай сітуацыі пераўтварэнням у друку Вялікабрытаніі пачатку 1990-х гг., калі, напрыклад, пасля набыцця медыямагнатам Рупертам Мэрдакам папулярнай лонданскай газеты "Sandi Times" быў звольнены кож-

ны трэці супрацоўнік, або з рэарганізацыяй у друку ФРГ у пачатку 1980-х гг. (дзе ізноў жа па вышэйназваных пазіцыях сітуацыя процілеглая беларускай), калі, напрыклад, у агенцтве эканамічнай інфармацыі "FWD" новыя менеджэры звольнілі палову журналістаў. Гэтая акцыя абгрунтоўвалася прынцыпам эканамічнай мэтазгоднасці: маўляў, каб павысіць канкурэнтаздольнасць выдання або агенцтва на інфармацыйным рынку, пажадана, каб адзін журналіст працаваў замест двух за тую ж зарплату.

Фармальна на Беларусі прадстаўнікі дзяржаўнай улады здзяйснялі практычна тую ж палітыку ў дачыненні да непрыбытковых выданняў, што і прадстаўнікі бізнесу ў Заходняй Еўропе ў дачыненні да фінансава падкантрольных ім рэдакцый, і мелі тыя ж законныя падставы: маўляў, калі газета ці часопіс выдаюцца за бюджэтныя грошы, дык дзяржаўныя органы маюць права трансфармаваць яго структуры ў адпаведнасці са сваёй эканамічнай палітыкай. На жаль, па сутнасці, ігнараванаю аказалася неабходнасць дзяржаўнай падтрымкі нацыянальнай культуры, якая зараз знаходзіцца ў крызісным стане не толькі па суб'ектыўных (названых Булгакавым), але і па аб'ектыўных, сацыяльна-эканамічных прычынах, што збіраліся не адно дзесяцігоддзе і нават стагоддзе.

Нягледзячы на ўсе намаганні кіраўніцтва Мінінфармацыі, у першую палову года пасля стварэння холдзінгу "ЛіМ" назіралася падзенне грамадскай цікавасці да дзяржаўнай прэсы. Сведчаннем гэтаму сталі вынікі падпісной кампаніі на другую палову 2002 г. – тыраж дзяржаўных выданняў скараціўся ў сярэднім на 15 %. Мелі месца факты, калі рэдактары свядома пазначалі завышаныя тыражы сваіх газет. Міністэрства інфармацыі выносіла строгую вымову ў кожным з такіх выпадкаў. Асабліва балюча перажывалі падзенне чытацкага інтарэсу рэгіянальныя дзяржаўныя выданні. Нязвыклых да творчай канкурэнцыі раённыя і абласныя газеты істотна пацяснілі на рынку альтэрнатыўныя недзяржаўныя выданні (Скурко 2002, 4).

Гэтая акалічнасць стала адной з прычын змены ў лістападзе 2002 г. кіраўніка рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і мастацтва". Сяргея Касцяна змяніла паэтэса і пісьменніца Таіса Бондар, якая за месяц да таго падала заяву аб звальненні з пасады галоўнага рэдактара часопіса "Всемирная литература". Новы кіраўнік выдавецкага холдзінга заявіла аб намеры ў бліжэйшай перспектыве трансфармаваць падначаленую ўстанову згодна з кітайскім узорам: "Калі мы ідзём у рынак (як бы мы марудна ні ішлі, але ўсё ж ідзём), мы будзем вымушаны ў перспектыве стварыць нешта накшталт акцыянернага таварыства... Сёлета я была ў Кітаі, наведала прыкладна такую ж рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову, але гэта – акцыянернае таварыства, у якім працуе і прыватны капітал і якому належаць не толькі выданні, але і маёмасць, друкарні" (Кузняцоў 2002, 8).

Наколькі плённымі акажуцца намаганні новага кіраўніка холдзінга, якія новыя рэформы адбудуцца і як яны паўплываюць на стан друкаваных СМІ, гэта стане зразумела ў бліжэйшай будучыні. Тым часам Міністэрства інфармацыі, галоўны рухавік пераўтварэнняў у інфармацыйнай прасторы Беларусі, заклапочана вырашэннем такіх важных праблем, як стварэнне Адзінага дзяржаўнага рэгістра (з мэтай спыніць бескантрольнае распаўсюджванне парнаграфіі на CD-дысках) і распрацоўка новага Закону аб друку (як адзначаў Міхаіл Падгайны, з улікам заўваг недзяржаўнай Беларускай асацыяцыі журналістаў).

І хаця вынікі распачатай летась рэформы яшчэ не падсумаваны, але некаторыя высновы мы ўсё ж можам рабіць.

Па-першае, трэба прызнаць, што, нягледзячы на дынаміку росту і якаснае ўзбагачэнне беларускай інфармацыйнай прасторы, у пачатку XXI ст. па розных прычынах прыбытковым дзяржаўны друк, найперш беларускамоўны, не стаў. І гэта паслужыла падставай для яго трансфармацыі.

Па-другое, нягледзячы на спецыфічныя асаблівасці рэформы па ўтварэнні рэдакцыйна-выдавецкіх устаноў "Літаратура і мастацтва" і "Культура", працэс трансфармацыі адбываўся па тых жа законах, што і ў краінах Заходняй Еўропы (пры радыкальным адрозненні нашай і заходняй эканомік, узроўняў развіцця і абароненасці нацыянальных культур).

І нарэшце, па-трэцяе, мы можам чакаць, што абраны накірунак трансфармацыі сёння мае добрыя перспектывы і, безумоўна, паспрыяе ўзбагачэнню інфармацыйнай прасторы нашай дзяржавы, хаця сцвярджаць плённасць гэтых рэформ пакуль рана. Павысіць канкурэнтаздольнасць беларускіх друкаваных СМІ на сусветным інфармацыйным і камунікацыйным рынку – адна з найбольш актуальных мэт для сучасных беларускіх мас-медыя, дасягненню якой павінна паспрыяць ужо ў бліжэйшай будучыні трансфармацыя сродкаў масавай інфармацыі, якая адбываецца на нашых вачах.

ЛІТАРАТУРА

Вараб'ёў В. Эвалюцыя палітычнай суб'ектнасці журналістыкі // Журналістыка 2002: Матэрыялы IV Міжнар. навук.-практ. канф. Мн., 2002. Вып. 4. С. 8.

Люмичева Л. Исследования коммуникатора в Болгарии, Польше, Чехии и Словакии: ретроспективный анализ журналистики стран бывшего социалистического лагеря // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 10. 1995. № 3. С. 32.

Томашевская О. У Подгайного есть план // Белорусская деловая газета. 2001. 19 дек. С. 3.

Булава Я. "Пісаць нам ёсць пра што, пра каго і для каго..." // Культура. 2002. 26 кастр. – 1 ліст. С. 6.

Булгакаў В. Пагібель "беларускіх пісьменьнікаў" // ARCHE. 2002. № 1. С. 13.

Скурко А. Павел Якубовіч: "Нацыянальная ідэя – супольны лёс" // Наша ніва. 2002. 25 кастр. С. 4.

Кузняцоў С. Таіса Бондар: "Холдынгу давядзецца выходзіць на рынак не толькі з літаратурна-мастацкімі часопісамі" // Звязда. 2002. 1 ліст. С. 8.

Паступіў у рэдакцыю 05.02.2003.

*Ягор Фёдаравіч Конеў* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры.

*Н.В. ВЕРБИЦКАЯ*

# ПРЕОБРАЗОВАНИЯ В ВОСТОЧНОГЕРМАНСКОЙ ПЕЧАТИ В ПЕРИОД 1989–1990 гг.

Исследуются преобразования в системе печатных СМИ Восточной Германии в 1989–1990 гг. Анализируется процесс изменения социального назначения и модификации функций восточногерманской прессы в период объединения двух германских государств.

The article deals with changes in printed mass media in Eastern Germany in the period from 1989 to 1990. The process of changes of social aims and modification of the press in Eastern Germany during the period of reuniting of both German states is analysed.

Конец XX в. стал поворотным в истории развития современной немецкой журналистики. Падение Берлинской стены и объединение 3 октября 1990 г. двух германских государств безоговорочно было признано событием десятилетия, положившим конец блочному разделению мира. В свою очередь перемены 1989–1990 гг. отразились на всех сферах общественной жизни двух германских государств и прежде всего на функционировании средств массовой информации. Исследование данного вопроса позволяет выделить две основные проблемы, последовательно возникшие в это время на рынке германских СМИ: обновление и перестройка всех структурных звеньев информационного пространства на востоке Германии с началом преобразовательных процессов 1989 г.; создание единой системы средств массовой информации объединенного государства. Оба вышеуказанных процесса